Ogłoszenia parafialne

I Нядзеля Адвэнту 2020

28 listopada 2020

Аб’явы

на нядзелю 29XI 2020

1. Новы касцёльны год распачынаем Адвэнтам. Няхай гэта будзе час нашай асабістай падрыхтоўкі да Свята Божага Нараджэння праз шчырую малітву, добрыя ўчынкі і адвэнтовыя пастановы. З даўніх часоў збіраемся ў Адвэнце пры Марыі на традыцыйных РАРАТАХ. Заахвочваем дзяцей зрабіць светачы. Рараты будуць у панядзелак, сераду і пятніцу а 6.45. Традыцыйна, дзеці будуць атрымліваць абразікі.
2. У кожную нядзелю Адвэнту запрашаю ў 10.45 на абрад святла.
3. Запрашаю на Эўхарыстычныя Дні:

*У чацвер о 18.15 – выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту малітва за парафію, а таксама аб святарскіх і манаскіх пакліканнях.

* У пятніцу адзведзіны хворых са св. Камуніяй. О 18.00 – выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту і магчымасць прыступіць да сакрамэнту пакуты. А 19.00 св. Імша і раніцай рараты а 6.45

4. Пасля св. Імшы на выхадзе з капліцы можна купіць аплатак на вігілійны стол за дабравольную ахвяру.

5.**У гэтым годзе не будзе рэкалекцый у Адвэнце. Перад святамі Божага Нараджэння будзе вызначаны дзень св. Споведзі.**

6. У сувязі з увядзеннем абавязку нашэння масак іх трэба таксама ўжываць у часе малітвы ў капліцы.

7. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.